# Слова Жыцця

## Сакавік 2016

## “Прыйшло да вас Божае Валадарства“

(Лк 11, 20)



**Менавіта гэтага чакалі габрэі ў Ягоныя часы. Езус, праходзячы праз вёскі і гарады, казаў: "Наблізілася да вас Валадарства Божае"** *(Лк 10,9)*; **"Прыйшло да вас Валадарства Божае"; "Валадарства Божае ўнутры вас ёсць"** *(Лк 17, 21)*.



У асобе Езуса
сам Бог прыйшоў
да свайго народу,
рашуча і моцна
ўзяўшы ягоны лёс
у свае рукі,
каб прывесці яго
да вызначанай
мэты. Цуды, якія
Езус чыніў, былі
знакамі гэтага.



Ва ўрыўку з Евангелля, што абраны за Слова Жыцця, Езус спачатку вылечыў нямога, вызваліўшы яго ад шатана, які трымаў яго ў няволі, каб даказаць, што Ён прыйшоў, каб перамагчы зло, усялякае зло, і, каб урэшце, аднавіць Валадарства Божае.



Гэтае словазлучэнне
"Валадарства Божае"
у лексіконе габрэйскага
народа ўказвае на Бога,
які дзейнічае на карысць
Ізраэля, вызваляе яго
ад усялякай няволі і зла,
прыводзіць да
справядлівасці і супакою,
напоўняе радасцю і мірам;



на таго Бога, якога Езус называе міласэрным айцом, поўным любові і спагады, уражлівым да патрэб і цярпенняў кожнага са сваіх дзяцей.



Гэтак жа і мы павінны пачуць словы Езуса:
*„Прыйшло да вас Божае Валадарства”.*



Гледзячы вакол сябе, мы часта маем уражанне, што свет апанаваны злом, што ў ім існуюць пераважна асобы агрэсіўныя і дэмаралізаваныя.



Часам мы адчуваем валадаранне процілеглых сіл і небяспечных падзей, якія нас прыгнятаюць.



Ва ўмовах войнаў, стыхійных бедстваў, перамены клімату, міграцыі і эканамічных і фінансавых крызісаў, мы адчуваем сябе бездапаможнымі.



І менавіта ў гэты момант з'яўляецца заклік Езуса, які запрашае нас паверыць, што з гэтага часу ён пераадольвае зло і стварае новы свет.



25 гадоў таму, у сакавіку, К'яра Любіч выступаючы перад тысячамі маладых людзей, даверыла ім сваю мару: "Зрабіць, каб свет стаўся лепшы, каб быў адною сям'ёю, прыналежнай адной айчыне, адзінаму салідарнаму свету, нават больш - свету з'яднанаму".



Аднак, каб гэтая мара
магла стаць рэальнасцю,
яна заахвочвала іх жыць
узаемнай любоўю, быць
упэўненымі, што робячы
так, яны сустрэнуць
паміж сабою «самога
Хрыста Ўсемагутнага».
А з Ім можна
спадзявацца на ўсё".
Так, бо Ён ёсць
Валадарства Божае.



А нашае заданне?
Дзейнічаць так, каб Ён заўсёды быў паміж намі.



А тады – казала далей
К'яра - "Ён будзе
супрацоўнічаць з вамі
ў вашых краінах, таму
што ў пэўны спосаб
Ён вернецца ў свет,
ва ўсе месцы,
дзе вы знаходзіцеся,
будзе прысутнічаць
праз узаемную любоў,
праз вашае адзінства.



Ён навучыць вас усяму, што трэба рабіць, будзе вас суправаджаць, падтрымліваць, будзе вашаю моцай, вашым запалам, вашай радасцю.
Дзякуючы Яму свет вакол вас вернецца да згоды, знікнуць усялякія падзелы. (…)



І тады любоў паміж вамі, а таксама і любоў, пасеяная ў многіх кутках зямлі, паміж групамі, паміж народамі, дзеля таго, каб інвазія любові – пра якую часта кажам - стала рэальнасцю, станецца чымсці канкрэтным таксама і праз ваш ўнёсак, станецца той цывілізацыяй любові, якой мы ўсе чакаем.





**Да гэтага вы пакліканы.**
**І вы ўбачыце вялікія рэчы"** [1].

*IV Міжнародны Фестываль "Моладзь за аб'яднаны свет" - Genfest, Rzym (Palaeur), 31.03.1990.*



“Прыйшло да вас Божае Валадарства”
*(Лк 11, 20)*

Testo di Padre Fabio Ciardi OMI

Grafica Anna Lollo in collaborazione con don Placido D’Omina (Sicilia, Italia)

* * *

Il commento alla Parola di Vita è tradotto ogni mese in 96 lingue e idiomi,
e raggiunge vari milioni di persone in tutto il mondo
tramite stampa, radio, TV e via internet.
Per informazioni www.focolare.org

.

Questo PPS, in diverse lingue, è pubblicato su www.santuariosancalogero.org